


**Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!**


Дзяніс Кіцель


Леанід Жыцянёў


Фёдар Савуцін

## Мы – Захавальнікі ТВП "Выганашчанскія балоты"!




Аляксандр Мялік

Аляксандр Іваноў


Маніторынг венерынага чаравічка

Калі Вы жывяце каля Выганашчанскіх балот ці маеце магчымасць наведваць іх, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Выганашчанскія балоты" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Выганашчанскія балоты", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, заказніка, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13, 8 (01645) 3-71-18**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік "Выганашчанскае"**
г. п. Целяханы
8 (01645) 3-71-18
vygon@mail.ru

Здымкі: М. Верабей, В. Давыдаў, А. Іваноў, В. Лукшыц, А. Мялік, С. Плыткевіч

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 408

Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org


Барадатая кугакаўка

Тэрыторыя, важная для птушак

# ВЫГАНАШЧАНСКІЯ БАЛОТЫ

Праект фінансуецца ЕС



Арлан-белахвост

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП "Выганашчанскія балоты" – буйнейшы ў Беларусі комплекс дробналісцевых забалочаных лясоў, балот, рачных пойм і мелкаводных азёр. Сярод балот захаваліся ў натуральным стане цяжкадаступныя астравы з унікальнай флорай і фаўнай.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Выганашчанскія балоты"

1. Важнымі месцамі канцэнтрацыі водна-балотных птушак падчас міграцый з'яўляюцца тыповыя палескія азёры: Баб-ровіцкае і Выганашчанскае.

2. Тэрыторыя мае статус рэспубліканскага ландшафтнага заказніка, а ў 2013 годзе была аб'яўлена Рамсарскім угоддзем (водна-балотнай тэрыторыяй міжнароднай значнасці).

3. Балоты з навакольнымі лясамі насяляе ключавая папуляцыя барадатай кугакаўкі ў Беларусі. Вялікія прыгожыя совы, сімвал Выганашчанскіх балот, займаюць старыя "кватэры" дзённых драпежных птушак. Вырашаць "жыллёвую праблему" ім дапамагаюць Захавальнікі Выганашчанскіх балот, якія будуюць штучныя гнёзды.



Барадатая кугакаўка з птушанятамі ў штучным гняздзе

4. Шматлікія леса-балотныя біятопы прыдатныя для звычайнай гадзюкі, таму яе колькасць тут самая высокая ў Беларусі. Гэта, у сваю чаргу, садзейнічае паспяховаму гнездаванню некалькіх пар арлоў-вужаедаў.



Жоўтагаловы дзяцел



Гадзюка

5. Унікальнасць фаўны падкрэсліваецца лакальнай канцэнтрацыяй глабальна пагражальнага віда – вялікага арляца, а таксама ўстойлівай папуляцыяй арлана-белахвоста. Тут шмат рэдкіх дзятлаў: жоўтагаловых і беласпінных.

## Што пагражае ТВП "Выганашчанскія балоты"?

- Парушэнне гідралагічнага рэжыму ў выніку дрэнажнай дзейнасці сістэмы каналаў, з-за чаго амаль усе балоты зарастаюць бярозавым жардняком і перыядычна гараць.



- Незаконная здабыча драпежных птушак, асабліва рэдкіх соў і арлоў.
- Інтэнсіўная высечка лясоў, асабліва дрэў з буйнымі гнёздамі і дупламі, а таксама насаджэнняў, дзе знаходзяцца прытулак рэдкія віды раслін і жывёл.
- Зарастанне хмызнякамі ў выніку спынення сенакашэння, што вядзе да змяншэння плошчы найбольш каштоўных нізінных балот і паплаваў.
- Верагоднасць торфараспрацоўкі, якая можа прывесці да страты ўнікальных прыродных умоў водна-балотнай тэрыторыі і яе біяразнастайнасці.



Верагодны ўчастак для торфараспрацоўкі

